# ЗМЕСТ

**да воп. № 3 (працяг) ф. 374**

| №№ | Назва раздзелаў | № спраў | № стар. воп. |
|---|---|---|---|
| | ПРАДМОВА | | |
| 12. | ФОТАПАРТРЭТ З.І. АЗГУРА | 46 | 1 |
| 13. | КАТАЛОГ ВЫСТАВЫ І.І. БЕЛАНОВІЧА | 47 | 1 |
| 14. | КАТАЛОГ ВЫСТАВЫ В.І. ВАСІЛЬЕВА | 48 | 1 |

## Прадмова (працяг)

Фотаздымак І.А. Азгура быў знойдзены ў 2026 годзе падчас падрыхтоўкі архівасховішча БДАМЛМ да перамяшчэння ў новы будынак, адначасна Наталля Яўгенаўна Кароль перадала ў БДАМЛМ каталогі І.І. Белановіча і В.І. Васільева. У выніку навуковага апісання быў складзены вопіс № 3 (працяг) у колькасці 3 спраў (3 дак.) ([1970-я – 1980-я гг.] – 1992).

Вопіс складаецца з трох раздзелаў (12–14), складзеных па алфавіце прозвішчаў дзеячаў мастацтва.

Раздзел 12 прадстаўлены фотапартрэтам скульптара-манументаліста **Азгура Заіра Ісакавіча** [1970-х – 1980-х гг.]. З.І. Азгур нарадзіўся 2 (15) студзеня 1908 года ў вёсцы Масоры Мошканскай воласці Магілёўскай губерні (цяпер – Мошканскі с/с Сенненскага раёна Віцебскай вобласці)[1] у беднай яўрэйскай сям'і (бацька – рамізнік, маці – жняя). У няпоўныя 5 год страціў бацьку і разам з маці, братам і [сястрой] пераехаў да дзядзькі ў Віцебск. Наведваў пачатковую рэлігійную школу пры сінагозе. Нейкі час навучаўся кавальскай справе, затым – разьбе па дрэве ў Югана Глека і ганчарству ў Піліпа Патапенкі. Пераломным момантам стала прыняццё З.І. Азгура ў "Школу рисунка и живописи художника Пэна", дзе ён правучыўся да 1921 года – да паступлення ў Віцебскі мастацка-практычны інстытут (майстэрня С.Б. Юдовіна)[2]. У 1923 годзе падчас рэарганізацыі ўстановы ў Віцебскі мастацкі тэхнікум здаў іспыт і быў залічаны на аддзяленне скульптуры (да М.А. Керзіна)[3]. У 1926–1928 гадах працягнуў навучанне ў Ленінградскім вышэйшым мастацка-тэхнічным інстытуце ў Р.Р. Баха, М.Г. Манізера, В.У. Лішэва і В.Л. Сіманава[4], у 1928–1929 гадах – у Кіеўскім дзяржаўным мастацкім інстытуце (цяпер – Нацыянальная акадэмія выяўленчага мастацтва і архітэктуры), з вясны 1929 года – у Тбіліскай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў (цяпер – Тбіліская дзяржаўная акадэмія мастацтваў Апалона Кутатэладзэ) у Я.Я. Лансерэ і Я.І. Нікаладзэ (вучня Агюста Радэна). У 1930 годзе вярнуўся ў Мінск. Не маючы майстэрні, займаўся вырабленнем скульптуры на дамах у знаёмых, браў удзел у афармленні Дома афіцэраў у Мінску, Дома ўрада БССР і інш. У 1941 годзе пераехаў у Гомель, дзе працаваў на пасадзе загадчыка мастацкім аддзелам агітплаката пры рэдакцыі ЦК КП(б) Беларусі, з пачаткам

[1] З. Азгур "То, что помнится… Рассказ о времени, об искусстве и о людях". – Мінск: "Беларусь", 1977, С. 6.

[2] У гэты час ён, не маючы дзе начаваць, заставаўся спаць у майстэрні, паклаўшыся ў вялізны куфар (З. Азгур "То, что помнится… Рассказ о времени, об искусстве и о людях". – Мінск: "Беларусь", 1977, С. 39).

[3] Гл. "Даваенная творчасць З.І. Азгура" на старонцы Мемарыяльнага музея-майстэрні З.І. Азгура (https://azgur.by/o-muzee/dovoennoe-tvorchestvo-z-i-azgura/).

[4] У гэты час Якуб Колас на працягу 3-х год штомесяц адпраўляў яму 40 рублёў (І. Свірко "Паэт у скульптуры", газета "Беларусь сегодня" ад 12 студзеня 2018 года / https://www.sb.by/articles/paet-u-skulptury.html).

Вялікай Айчыннай вайны самастойна эвакуіраваўся ў тыл. У 1942–1944 гадах быў камандзіраваны для працы ў аддзеле прапаганды і агітацыі на пасадзе скульптара ў Кіраўніцтве па справах мастацтваў пры СНК БССР у Маскве. За час вайны страціў маці і першую жонку – актрысу БДТ-1 Марыю Шашалевіч[5]. У 1944 годзе вярнуўся ў Мінск, працаваў галоўным мастаком Дома ўрада БССР. У 1945 годзе ўзяў шлюб з Галінай Гарэлавай (дачкой акадэміка Гаўрыіла Гарэлава). У 1947 годзе быў абраны членам-карэспандэнтам Акадэміі мастацтваў СССР, у 1958 годзе стаў дзейсным яе членам. З 1980 года кіраваў Творчай майстэрняй скульптуры мастацтваў СССР у Мінску (цяпер – Творчая акадэмічная майстэрня скульптуры Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь). У 1995 годзе абраны акадэмікам НАН Беларусі.

Упершыню працы скульптара экспанаваліся ў Віцебскім мастацкім тэхнікуме на справаздачнай выставе за 1923/1924 год, з 1924 года ён браў удзел у рэспубліканскіх мастацкіх выставах. Найбольш вядомыя мастацкія працы З.І. Азгура: скульптуры Рабіндраната Тагора (1956); манументальныя партрэты Фелікса Дзяржынскага (1947), Янкі Купалы (1947–1949, Вязынка), Канстанціна Ракасоўскага (1951), Лу Сіня (1953–1954), Кастуся Каліноўскага (1958), Пятра Машэрава (1981, Віцебск) і інш.; помнікі Іосіфу Сталіну (1952, Мінск), Аляксандру Пушкіну (1956, Астрахань), ансамбль на плошчы імя Якуба Коласа (1972, Мінск) і інш. Ім напісана звыш 500 публіцыстычных артыкулаў па мастацтвазнаўству, кніг успамінаў “Незабываемое” (Мінск, 1962) і “То, что помнится… Рассказ о времени, об искусстве и о людях” (Мінск, 1977–1994).

У 1939 годзе З.І. Азгуру прысвоена ганаровае званне “Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР”, у 1944 годзе – “Народны мастак БССР” (пасведчанне № 1), у 1952 годзе – “Заслужаны дзеяч мастацтваў Дагестанскай АССР”, у 1973 годзе – “Народны мастак СССР”.

Атрымаў Дзяржаўную прэмію СССР (1946 і 1948) і Сталінскую прэмію другой ступені (1946 і 1948), залатыя медалі Міністэрства культуры СССР (1958) і Італьянскай акадэміі выяўленчага мастацтва (1980), срэбны медаль Сусветнай выставы ў Брусэлі (1958), медаль Францыска Скарыны (1992); узнагароджаны ордэнамі: Працоўнага Чырвонага Сцяга (1940 і 1949), Чырвонай Зоркі (1943), Леніна (1955 і 1978), Кастрычніцкай Рэвалюцыі (1971), Дружбы народаў (1987) і інш.

Творы З.І. Азгура знаходзяцца ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь, Мемарыяльным музеі-майстэрні З.І. Азгура; Нацыянальным музеі выяўленчага мастацтва Малдовы; Астраханскай дзяржаўнай карціннай галерэі імя М.П. Дагадзіна і Дзяржаўнай Траццякоўскай галерэі (Расія) і інш.

У 1996 годзе на базе яго творчай майстэрні быў створаны Мемарыяльны музей-майстэрня З.І. Азгура. Яго імя прысвоена адной з вуліц і СШ №1 горада Сянно Віцебскай вобласці, на будынку былога Віцебскага мастацкага

[5] Маці немцы жыўцом закапалі ў зямлю, жонка загінула падчас сыходжання пад Омскам вагонаў цягніка, калі трупа БДТ-1 вярталася з эвакуацыі ў Мінск.

тэхнікума і доме, дзе ён жыў у Мінску, змешчаны мемарыяльныя дошкі З.І. Азгуру, вуліца на месцы знаходжання яго былой майстэрні перайменавана ў вуліцу З.І. Азгура, у 2008 годзе Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь выпусціў памятную манету "З. Азгур. 100 год".

З.І. Азгур памёр 18 лютага 1995 года, пахаваны на Усходніх могілках у Мінску.

Раздзел 13 прадстаўлены каталогам персанальнай выставы мастака **Белановіча Іосіфа Іосіфавіча** (1992). І.І. Белановіч нарадзіўся 9 траўня 1920 года ў сям'і рабочага ў Мінску. У 16-гадовым узросце пераехаў у Ніжні Тагіл (РСФСР), затым – у Перм (РСФСР), дзе паступіў у Пермскі мастацка-педагагічны тэхнікум, які не паспеў скончыць з-за прызыва ў Чырвоную армію ў 1941 годзе. Падчас Вялікай Айчыннай вайны служыў у Кіеўскай ваеннай акрузе, ваяваў на 3-м Беларускім фронце. У 1945 годзе вярнуўся ў Мінск, працаваў у мастацка-вытворчых майстэрнях. У 1959 годзе у складзе першага выпуску скончыў Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут (цяпер – Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў). Вучыўся ў В.В. Волкава, А.П. Мазалёва, В.К. Цвіркі (тэмай дыпломнай працы была абарона Брэсцкай крэпасці). Пасля інстытута працаваў выкладчыкам малюнка на архітэктурным аддзяленні Беларускага політэхнічнага інстытута (цяпер – Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт).

Значнае месца ў творчасці займала графіка. Да ліку лепшых прац мастака адносяцца: сюжэтна-тэматычныя карціны "Сейбіты" (1977), "Хлеб партызанам" (1978), "Зямля мужнасці" і "Эшалоны" (1981), "Камсамольцы 30-х гадоў" і інш., партрэты Я. Купалы (1980), М. Багдановіча (1991) і інш., пейзажы і нацюрморты. Занятку малюнкам перашкаджала адсутнасць да 1974 года ўласнай майстэрні.

З 1962 года – сябра Саюза мастакоў БССР.

Узнагароджаны ардэнамі "Айчыннай вайны" І і ІІ сцепені, Чырвонай Зоркі, медалямі "За адвагу" і "За баявыя заслугі" і інш.

Творы І.І. Белановіча знаходзяцца ў Дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусі, фондах Беларускага саюза мастакоў, мемарыяльным комплексе "Брэсцкая крэпасць-герой", Нацыянальным цэнтры сучаснага мастацтва, у прыватных калекцыях і інш.

І.І. Белановіч памёр 17 траўня 1998 года.

Раздзел 14 прадстаўлены каталогам персанальнай выставы мастака **Васільева Васіля Іванавіча** (1987). В.І. Васільеў нарадзіўся 1 чэрвеня 1927 года ў шматдзетнай сялянскай сям'і ў вёсцы Тушавая Горацкага раёна Аршанскай акругі (цяпер – Магілёўская вобласць). Перад пачаткам Вялікай Айчыннай вайны сям'я перасялілася ў Рыгу (Латвійская ССР), адтуль В.І. Васільеў добраахвотнікам пайшоў на фронт, служыў у рамонтных авіяцыйных майстэрнях 5-й паветранай арміі. Пасля вайны вярнуўся ў Літву.

У 1952 годзе скончыў Вільнюскі дзяржаўны мастацка-графічны інстытут. Вучыўся ў Вітаўтаса Мацкявічуса (дыпломная праца – "Электрификация деревни"). У 1960 годзе пераехаў у Мінск. У 1960–1986 гадах выкладаў у Мінскім мастацкім вучылішчы імя А.К. Глебава (цяпер – Мінскі дзяржаўны каледж мастацтваў імя А.К. Глебава).

Працаваў у акварэлі, жывапісу, тэмперы пераважна ў жанрах пейзажа і партрэта. Асноўныя працы: "Вечер" (1966), "Весенняя пахота", "Наперекор волнам" і "На водопой" (1967), "Осенний мотив" (1973), "Браславщина" і "Осень на Вяче" (1975), "Лён" (1977), "Доярки" і "Уборка капусты" (1978), "Вечер" (1981), "Ферма" (1990), "Полесский пейзаж" (1995), "Беловежская пуща" (1996) і інш.

Творы В.І. Васільева знаходзяцца ў Горацкім раённым гісторыка-этнаграфічным музеі, Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь, фондах Беларускага саюза мастакоў і інш.

Прадмову склала
Заг. аддзела В.Ф. Шаталава
29.04.2026

Установа "Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва"

ФОНД № 374
ВОПІС № 3 (працяг)
[1970-я - 1980-я гг.] - 1992

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пратакол ЭМК БДАМЛМ
ад 15.05.2026
№ 7

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **12. ФОТАПАРТРЭТ З.І. АЗГУРА** | | | | |
| 46 | Фотапартрэт З.І. Азгура | [1970-я - 1980-я гг.] | 1 | 1 | |
| | **13. КАТАЛОГ ВЫСТАВЫ І.І. БЕЛАНОВІЧА** | | | | |
| 47 | Каталог персанальнай выставы І.І. Белановіча. Друкаванае выданне | 1992 | 16 | 1 | |
| | **14. КАТАЛОГ ВЫСТАВЫ В.І. ВАСІЛЬЕВА** | | | | |
| 48 | Каталог персанальнай выставы В.І. Васільева. Друкаванае выданне | 1987 | 17 | 1 | |

У дадзены раздзел вопісу ўнесена 3 справы (3 дакументы) з № 46 да № 48, у тым ліку:
літарныя нумары
прапушчаныя нумары

Усяго ў вопіс уключана 48 справы з № 1 па № 48, у тым ліку:
літарныя нумары
прапушчаныя нумары

Вопіс склала і апрацоўку фонду зрабіла
заг. аддзелам ______________ В.Ф. Шаталава

2026

Дакументы прынялі:
вяд. архівіст аддзела забеспячэння захаванасці дакументаў ______________ В.І. Бярэйшык

"___"___________ 20____г.